6. Иезуиты – : URL: https://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%98%D0%B5%D0%B7%D1%83%D0%B8%D1 %82%D1%8B (дата обращения: 17.08.2023).

7. Королева, И. А. Сакрально-богослужебная лексика в современном русском языке и в художественном тексте : автореф. дис. …канд. филол. наук: 10.02.01 / И. А. Королева. – Волгоград, 2002. – 18 с.

8. Костел и монастырь бригиток в Гродно. – URL: https://planetabelarus.by/sights/kostel-i-monastyr-brigitok-v-grodno/ (дата обращения: 17.08.2023).

9. Мезенко, А. Духовность и пути ее репрезентации в белорусской урбанонимии и виконимии / А. Мезенко // Chrześcijańskie dziedzictwo duchowe narodów słowiańskich. Język. Literatura. Kultura. Historia / red. Z. Abramowicz, K. Korotkich. T. 1. – Białystok, 2016. – С. 325–332.

10. Мезенко, А. М. Отэкклезионимные урбанонимы как имена собственные, соотносимые с категорией святости / А. М. Мезенко // Материалы междунар. метод. семинара «Витебщина и Смоленщина в языковых и культурных контактах: история и современное состояние», вып. 2. – Смоленск, 2011. – С. 74–78.

11. Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ).

12. От мальтийских рыцарей до коммунистов. – URL: https://planetabelarus.by/publications/ot-maltiyskikh-rytsarey-do-kommunistov-vosem-samykh-izvestnykh-monasheskikh-ordenov-v-belarusi/ (дата обращения: 16.08.2023).

13. Полоцкая ревизия 1552 г. – Москва, 1905. – 273 с.

14. Разумов, Р. В. Урбанонимы, мотивированные экклезионимами, в системе городских названий / Р. В. Разумов // Русское народное слово в языке и речи: Материалы Всероссийской науч.-практ. конф., посвящ. 75-летию Арзамасского гос. пед. института им. А.П. Гайдара (22–24 октября 2009 года). – Арзамас–Саров, 2009. – С. 310–315.

15. РОБВУ: Рукописный отдел библиотеки Вильнюсского государственного университета: F 4 – 18130 (А– 238).

16. Супрун, В. И. Христианизация русского именника / В. И. Супрун // Христианство. – 1996. – № 2. – С. 53–58.

17. Ткач, М. И. Тайны католических монашеских орденов / М. И. Ткач. – Москва : РИПОЛЛ КЛАССИК, 2007. – 423 с.

**М.В. Півавар**
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Віцебскае кадэцкае вучылішча”

УДК 726:27-522(476.5)

# МЕМАРЫЯЛІЗАЦЫЯ МЕСЦАЎ БЫЛЫХ ХРЫСЦІЯНСКІХ СВЯТЫНЬ НА ВІЦЕБШЧЫНЕ

*У сувязі з ваяўнічым атэізмам і безбожніцтвам ў СССР праваслаўная царква перажывала цяжкія часы. Знішчаліся храмы, праводзіліся рэпрэсіі супраць святароў і вернікаў. Асабліва пацярпелі ў “цёмныя” часы храмы. На пачатку XX ст. у Віцебскім павеце было 55 цэркваў і капліц, а на 1991 г. у Віцебскім раёне заставаўся толькі 1 храм, і той у закінутым стане. Важным сродкам аднаўлення традыцый праваслаўнай царквы і мемарыялізацыі памяці пра знішчаныя храмы*

*з’яўляецца адзначэнне месцаў былых святынь мемарыяльнымі крыжамі. Правільна было б таксама ўстанаўліваць побач інфармацыйна-мемарыяльныя шыльды. На жаль, у Віцебскім раёне ўвекавечана памяць толькі пра 10% былых храмаў і капліц. Мэта артыкула – вызначыць колькасць храмаў і дакладныя месцы, дзе яны знаходзіліся. У выніку аналізу крыніц, палявых экспедыцый па раёне, намі было выяўлена, удакладнена амаль 20 месцаў былых храмаў. Працягваецца работа па ўдакладненню месцаў цэркваў, капліц, паклонных крыжоў, святых крыніц.*

Ключавыя словы: *мемарыялізацыя, ушанаванне памяці, храмы, святыні, мемарыяльны крыж, хрысціянскія традыцыі.*

Хрысціянства з’яўляецца асновай еўрапейскай цывілізацыі. У аснове культуры і ладу жыцця беларусаў ляжаць хрысціянскія каштоўнасці. Аднак у савецкі перыяд у сувязі з ваяўнічым атэізмам і бязбожніцтвам хрысціянства перажывала цяжкія часы. Зачыняліся і руйнаваліся храмы, рэпрэсіраваліся святары, забараняўся былы лад жыцця, заснаваны на хрысціянскіх традыцыях. Знешняй праявай хрысціянства ў штодзённым жыцці з’яўляюцца храмы. Аднак менавіта яны асабліва пацярпелі ў “цёмныя” часы. Прывядзем прыклад Віцебскага раёна. На 1917 г. у Віцебскім павеце, які амаль паўтарае межы сучаснага раёна, было 34 храма, 21 прыпісная царква і капліца [8, с. 6–15]. На 1991 г., калі савецкая ўлада зрабіла паслабленні для царквы і пачала вяртаць ўласнасць РПЦ вернікам, у раёне захставаўся толькі 1 храм, і той у закінутым стане – у с. Лужасна. Адзін з 55! Лічым неабходным, каб месцы былых храмаў і капліц былі адзначаны мемарыяльнымі крыжамі, а таксама інфармацыйна-мемарыяльнымі шыльдамі ці памятнымі знакамі. Добрыя прыклады ёсць. У в. Старое Сяло на месцы храма ўзведзены памятны знак. Драўляны крыж стаіць каля рэшткаў храма ў в. Курына, Заронава, металічны крыж у в. Друкава (Фалькавічы). Ёсць крыжы і ў некаторых іншых месцах, аднак далёка не ўсе месцы адзначаны. Мэта артыкула – вызначыць месцы, дзе былі праваслаўныя храмы і капліцы. Такая інфармацыя будзе карысна як для прастых вернікаў, так і святароў.

Першай задачай з’яўляецца вызначэнне дакладнай колькасці храмаў і капліц і іх размяшчэння на тэрыторыі Віцебскага раёна. У гэтым можна абапірацца на розныя крыніцы. Важнейшай з іх з’яўляецца кніга “Статистические сведения о церквях и причтах Полоцкой епархии” [8]. Аднак яна падае дадзеныя на 1884 г. Спісы цэркваў змяшчаліся ў “Памятных книжках Витебской губернии” у тым ліку і на 1914 г. [4]. У кнізе “Полоцкая епархия к 1903” [7], выдадзенай З. Даўгялам на пачатку ХХ ст. згадваюцца прыходскія храмы, прыпісныя цэрквы і капліцы.

Інфармацыю пра праваслаўныя храмы на тэрыторыі Беларусі можна атрымаць і з даведачнага выдання А. Кулагіна [3]. У кнізе “Памяць” Віцебскага раёна [5] прыводзіцца спіс страчаных цэркваў. Пэўныя звесткі можна пачэрпнуць з кнігі “Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы” [2, с. 263–268]. Стан на пачатак XXI ст. можна ўявіць на падставе звестак даведніка “Віцебская епархія”, укладальнікам якога з’яўляецца А.Ф. Матвееў [1]. М. Півавар у кнізе “Краязнаўчы атлас Мазалаўскага сельскага савета Віцебскага раёна” згадвае дакладныя месцы былых храмаў у вв. Храпавічы, Шалыгі, Вярхоўе, прыводзіць іх фотаздымкі, звесткі пра стан [6]. Значна больш месцаў згадваецца ў “Краязнаўчым атласе Віцебскага раёна”, які падрыхтаваны да выдання, але пакуль не выйшаў у свет.

Аднак далёка не ўсе храмы, прыпісныя цэрквы і тым болей капліцы дайшлі да нашага часу. Пра некаторыя, нават не вядома і месца, дзе яны знаходзіліся, бо зніклі нават вёскі і няма ў каго запытацца. Часам мясцовыя жыхары з цяжкасцю прыгадваюць месца знаходжання населенага пункта, не тое, што былога храма. Месцы, дзе былі вёскі параслі лесам, дарог няма, старыя карты часта даюць толькі прыкладнае месца, дзе знаходжіўся храм. Вызначэнне дакладнага месцазнаходжання былых храмаў – складаная задача. У нашым артыкуле мы прадставім вынікі толькі папярэдніх даследаванняў.

У выніку аналізу дадзеных пісьмовых крыніц, мы ведаем, што на тэрыторыі Віцебскага павета на пачатак XX ст. знаходзіліся 76 храмаў і капліц. З іх 21 цяпер знаходзяцца на тэрыторыі іншых раёнаў:

- Гарадоцкага: Кабішча (2 храма), Казловічы (2 храма), Латыгава, Стайкі;
- Лёзненскага: Веляшкавічы (2 храма), Калышкі (2 храма), Замшаны;
- Шуміліскага: Жарэбычы (2 храма), Завяззе, Лескавічы (2 храма), Полцева, Рабушкі, Ужляціна (2 храма).

Месца, дзе быў Вярхоўскі храм знаходзіцца у нашы дні на тэрыторыі Веліжскага раёна Расійскай Федэрацыі.

З былых 55 храмаў і капліц на тэрыторыі сучаснага раёна адзначаны крыжамі і памятнымі знакамі толькі некалькі:

- рэшткі царквы Св. Мікалая Цудатворца ў в. Курына (драўляны крыж);
- месца былога храма Святога Ануфрыя ў в. Заронава (драўляны крыж);
- месца, дзе быў храм Раства Багародзіцы ў Вярхоўі, цяпер Руба-2 (драўляны крыж);
- месца царквы Божай Маці, ў якой знаходзілася шануемая ікона Маці-Божай Фалькавіцкай у в. Друкава (металічны крыж);

– памятны знак на месцы Свята-Уваскрасенскай царквы (Старае Сяло).

У выніку аналізу крыніц, палявых выхадаў і экспедыцый па раёне, намі было выяўлена, удакладнена месцазнаходжанне былых храмаў:

– Каменныя падмуркі былой Траецкай царквы (Храпавічы). Знаходзяцца на правым беразе р. Храпаўлянка, каля могілак. Каардынаты: 55.332111, 30.153938.
– Падмуркі былой Пакроўскай царквы (ур. Каралева). У 1,5 км па дарозе Яроміна–Жаўнярова, на высокай гары, якая служыла гарадзішчам для жыхароў днепра-дзвінскай археалагічнай культуры. Захаваліся некаторыя помнікі старых могілак. Каардынаты: 55.139320, 30.499272.
– Падмуркі капліцы Параскевы-Пятніцы (Слабада). Знаходзяцца непадалёк ад паўночнай ускраіны вёскі, з правага боку дарогі ад Слабады на в. Пруднікі ва ўрочышчы "Пяцінка". У 2021 г. сіламі Задуброўскага сельсавета (С.В. Макуха), пры дапамозе ААА "Ганна", аграэкасядзібы «Звон Гара» месца было добраўпарадкавана: выкарчаваны кусты, праведзена нівеліроўка мясцовасці, выйсце Святой крыніцы ўзята ў бетоннае кола з трубой. Побач, на вымашчанай тратуарнай пліткай пляцоўцы пастаўлена драўляная альтанка. Навокал высаджаны дэкаратыўныя кусты, кветкі, ўсталяваны інфармацыйны банэр. Месца, дзе была капліца дакладна вызначаецца цэглавым друзам і парослымі мохам валунамі ад падмуркаў. Каардынаты: 55.414190, 30.591809
– Месца, дзе была Траецкая царква (Дрыколле, ур. Шалыгі). У 2 км на захад ад вёскі, ва ўрочышчы Шалыгі. На высокім пагорку, які выкарыстоўваўся ў старажытнасці як гарадзішча. Гэтую гару і цяпер называюць Царкавішчам. Побач старадаўнія могілкі, якія таксама варта адзначыць мемарыяльным крыжом. На іх захавалася больш за 20 каменных крыжоў, якія датуюцца XVI–XIX стст. Каардынаты: 55.278122, 30.043949.
– Месца былой капліцы ў маёнтку Цялятнікі (Ноўка). Капліца знаходзілася на могілках. Непадалёк воданапорная вежа. Каардынаты: 55.134719, 30.156405.

Іх, на нашу думку варта ўшанаваць у першую чаргу, па той прычыне, што месцазнаходжанне іх дакладна вядома, да нашага часу захаваліся матэрыяльныя сведчанні іх існавання (падмуркі, часткі сцен, планіроўка).

Намі вызначана месца, дзе знаходзілася Свята-Пакроўская царква (Астраўскія). Каля могілак. Дакладней, само месца ўжо занята новымі пахаваннямі. Непалёк назіральная вышка Астраўскога лясніцтва. Каардынаты: 55.440782, 30.615056.

Вядомы нам і месцы былых храмаў, на якіх, на жаль, амаль нічога не засталося, і іх удакладненне патрабуюць больш дасканалых даследаванняў ці археалагічных раскопак. Гэта месца былой Ільінскай царквы (Шабуні) і месца капліцы ў Вярхоўі, цяпер Руба-2.

Відавочна, што дзеля захавання памяці пра былыя святыні трэба адзначыць крыжамі ці іншым чынам вызначыць памяць пра храмы ў вёсках: Бабінічы, Вымна, Глазамічы, Казакова, Кабыльнікі, Котава, Лемніца, Слабада, Лосвіда, Любашкова, Паддуб'е, Пышнякі, Сялюты, Стасева, г.п. Сураж, г.п. Янавічы. Але іх вызначэнне патрабуе адмысловых даследаванняў.

Складана вызначыць месцы на былых вёсках, якія зараз не існуюць: Мядзельна, Пенкавічы, Стахоршчына і іншых.

Не зможам паставіць крыж на месцы былой царквы ў Гаралёва (Гралёва). На месцы вёскі вядзецца распрацоўка даламіту і ўтвораны кар'ер "Гралёва".

Такім чынам, з існаваўшых у XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі Віцебскага раёна і знішчаных у гады ваяўнічага атэізму 55 храмаў і капліц адзначаны мемарыяльнымі крыжамі толькі нязначная частка (меней за 10%). На нашу думку, варта адзначыць месцы, дзе знаходзіліся найбольш важныя святыні, а ў ідэале – ўсе месцы, дзе былі храмы на тэрыторыі раёна. Намі сабрана пэўная інфармацыя (фотаздымкі месцаў, дзе знаходзіліся храмы, каардынаты, сведчанні сведкаў) пра выяўленыя намі месцы былых храмаў і капліц. Лічым, што ў першую чаргу мемарыялізацыі падлягаюць месцы храмаў, потым капліц. Працу па выяўленні месцаў былых святынь трэба працягваць.

1. Витебская епархия. Монастыри, храмы и приходы : справочник / сост. А. Матвеев. – Минск : Белорусская Православная Церковь, 2009. – 156 с.

2. Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы / І. А. Абрамава [і інш.] ; уклад. М. В. Півавар. – Мінск : Паркус плюс, 2008. – 328 с.

3. Кулагін А. М. Праваслаўныя храмы на Беларусі : энцыклапедычны даведнік / А. М. Кулагін. – Мінск : БелЭн, 2001. – 328 с.

4. Памятные книжки Витебской губернии на 1914 г. – Витебск : Губернская типография, 1914. – 405 с. – С. XXVI– XXVIII.

5. Памяць: Віцебскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / уклад. У. І. Мезенцаў. – Мінск : Маст. літ., 2004. – 772 с.

6. Півавар, М. В. Краязнаўчы атлас Мазалаўскага сельскага савета Віцебскага раёна / М. В. Півавар. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2021. – 120 с.

7. Полоцкая епархия к 1903 году / сост. Д. Довгялло. – Витебск : Губернская типо-литография, 1903. – 106 с.

8. Статистические сведения о церквях и причтах Полоцкой епархии. – Витебск, 1884. – 92 с.